*В.С. КУРЫЛЁНАК*

# МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК “ЗАСЛАЎЕ” Ў ЛЮСТЭРКУ ГІСТОРЫІ

Музеі-запаведнікі — гэта так званыя комплексныя музеі. “Большасць з іх прысвечана пэўнаму рэгіёну ці супольнасці і мае магчымасць адлюстроўваць прыродную і сацыяльную гісторыю, традыцыі, стваральны дух тэрыторыі” [3, с. 31]. Яны аб’ядноўваюць цэлы комплекс разнастайных кірункаў: музеязнаўчы, гістарычны, этнаграфічны, мастацтвазнаўчы і “асяродкавае выхаванне”. Апошні з іх прадугледжвае “цэласныя адносіны да прасторы і часу, а таксама некаторую інтуітыўнасць выяўлення самых розных каштоўнасцей існуючага асяроддзя” [7, с. 17]. Гэта вельмі важна, асабліва сёння, бо спрыяе прымірэнню сучаснага чалавека з прасторавай разнастайнасцю, якая вельмі часта дысануе з багатай гісторыяй, культурнымі здабыткамі, непаўторнымі помнікамі краіны.

Заслаўе — адзін з нешматлікіх гарадоў Беларусі, які ў сваім развіцці перасягнуў тысячагадовую мяжу. Традыцыйныя элементы культуры беларусаў з уласцівымі местачковымі асаблівасцямі, а менавіта гарадзішча “Замэчак” X ст., курганныя могільнікі X—XI стст., гарадзішча “Вал” XУI ст., будынкі былога кальвінскага збору канца XУI ст. і касцёла Св.Марыі канца XУIII ст., рэшткі палацавага комплексу, які належаў у XIX ст. Пшэздзецкім, планіровачная структура вуліц сярэдневяковага горада (XII—XУII стст.), а таксама маляўнічыя ланшафты, што акаляюць старую частку горада, — усе гэтыя адметнасці пры стварэнні музея-запаведніка неабходна было захаваць.

Першы крок па ажыццяўленні названай мэты быў зроблены ў 1967 г., калі паводле пастановы Савета Міністраў БССР быў створаны Заслаўскі гісторыка-археалагічны запаведнік.

У яго склад увайшлі гарадзішчы “Вал” і “Замэчак”. Спецыялізаваныя навукова-рэстаўрацыйныя вытворчыя майстэрні Міністэрства культуры БССР распрацавалі і пачалі ажыццяўленне праекта рэстаўрацыі былога кальвінскага збору, у якім павінен быў размясціцца філіял Дзяржаўнага музея БССР; праводзілася кансервацыя рэшткаў Вялікай брамы і абарончага вала, добраўпарадкавалася тэрыторыя.

Адначасова Дзяржаўны музей БССР праводзіў работу па падрыхтоўцы да адкрыцця ў Заслаўі свайго філіяла. У прыватнасці, быў вызначаны профіль экспазіцыі, распрацаваны тэматыка-экспазіцыйны план, праект яе мастацкага рашэння, сабраны неабходныя экспанаты. У 1977 г. філіял Дзяржаўнага музея БССР у Заслаўі адчыніў дзверы першым наведвальнікам [2, с. 29—30].

Вызначальную ролю ў далейшым лёсе запаведніка адыграла пастанова Савета Міністраў БССР “Аб мерах па развіцці горада і стварэнні ў ім гісторыка-культурнага запаведніка”, прынятая ў 1986 г. [1, с. 265]. Па сваёй сутнасці, змесце і кірунках яна спрыяла інтарэсам мадэрнізацыі, урбанізацыі жыцця ў горадзе. Быў спланаваны шэраг новабудоўляў, прадугледжана іх фінансаванне. Аб стварэнні ж запаведніка гаварылася ўскосна, бо ні механізм, ні тэмпы, ні напрамкі яго развіцця не былі прадугледжаны. Ускладняла існуючы стан спраў амаль поўная адсутнасць забеспячэння: абсалютная нераспрацаванасць у Беларусі як тэарэтычных, так і практычных пытанняў у падыходах да музеефікацыі помнікаў in situ сярод іх звычайнага акружэння,што вельмі абцяжарвала праблему [4, с. 56].

У 1988—1989 гг. супрацоўнікамі запаведніка разам з навукоўцамі рэспублікі разглядаліся некалькі варыянтаў канцэпцыі запаведніка [9]. Нарэшце, у выніку шматлікіх дыскусій быў выпрацаваны і зацверджаны ў 1989 г. яе канчатковы варыянт.

Адной з галоўных мэт канцэпцыі з’яўляецца “ўзнаўленне такога жыццёвага стану жыхароў Заслаўя, пры якім кожны чалавек, маючы ўласнае жаданне, быў бы здольны ўсведаміць, успрымаць месца свайго жыцця як унікальны куток зямлі, дзе захаваліся для нашчадкаў духоўны лад і адметнасць побыту беларускага народа...” [6, с. 1].

Упершыню ў Беларусі горад разглядаўся як культурная экасістэма, а ланд-шафтнаму атачэнню горада надавалася асаблівая каштоўнасць як крыніцы ўспрымання.

Жыццё патрабавала змяніць у лепшы бок адносіны мясцовага насельніцтва да сваёй спадчыны ўвогуле і да запаведніка ў прыватнасці. А гэта немагчыма зрабіць, не маючы дастатковага ўяўлення аб запытах, перавагах, інтарэсах патэнцыяльнай аўдыторыі. Менавіта таму ў 1989 г. было праведзена сацыялагічнае даследаванне, якое дапамагала “высветліць грамадскую думку па шырокім коле пытанняў, звязаных са стварэннем запаведніка, і больш шырокіх адносін насельніцтва да складаных для рэспублікі праблем культурна-духоўнага адраджэння ...” [5, с. 2].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праведзена апытанне трох катэгорый насельніцтва: 1) жыхароў горада Мінска; 2) жыхароў старога раёна горада Заслаўе; 3) жыхароў астатніх раёнаў горада Заслаўе.

У працэсе даследавання высвятляліся:

— узровень гістарычных ведаў рэспандэнта,крыніц іх папаўнення;

— установкі (жаданне—нежаданне) на больш глыбокае і ўсебаковае веданне народных традыцый, абрадаў, песень,беларускай мастацкай літаратуры;

— ступень укаранення ў побыце, у паўсядзённым жыцці людзей элементаў традыцыйнай народнай культуры;

— распаўсюджанасць беларускай гутарковай мовы, імкненне да больш шырокага яе выкарыстання, адносіны да навучання дзяцей у беларускай школе;

— адносіны да прапановы аб стварэнні запаведніка “Заслаўе”, магчымасці асабістага садзейнічання гэтаму;

— адносіны да развіцця сацыяльнай сферы ў Заслаўі.

Па ўсіх вызначаных у праграме даследавання пытаннях меркавалася са- браць у ходзе апытання і інтэрв’ю прапановы, пажаданні і заўвагі рэспандэнтаў. Ускосная мэта даследавання заключалася ў тым, каб пазнаёміць людзей, у прыватнасці жыхароў Мінска, да гэтага не інфармаваных аб плане па разглядаемым пытанні, з работай па арганізацыі запаведніка “Заслаўе”.

Матэрыялы сацыялагічнага даследавання з’явіліся першым крокам на шляху мэтанакіраванага вывучэння музейнай аўдыторыі Беларусі.

Пастанова Савета Міністраў БССР ад 19 верасня 1990 г. «Аб гісторыка-культурным запаведніку “Заслаўе”» зацвярджала статус запаведніка і фіксавала межы яго ахоўнай зоны і межы зон рэгулявання забудовы ахоўваемага прыроднага ландшафту [8, с. 1]. Гэта быў чарговы крок на шляху прызнання за музеем статуса гісторыка-культурнага запаведніка.

Навуковыя супрацоўнікі музея складаюць сапраўдную творчую групу аднадумцаў.

Першым крокам па захоўванні помнікаў у кантэксце з усім прыродным і культурным акружэннем стала для запаведніка стварэнне музея “Млын”. Пабудаваны Ясонам Мяхедка-Савіцкім у пачатку XX ст., занядбаны і нікому не патрэбны, ён быў ахвотна прададзены ў 1989 г. запаведніку мясцовай карданажна-паліграфічнай фабрыкай. У адпаведнасці з праектам (архітэктар М.Лук’янчык, экспазіцыянер А.Краснова, мастак Г.Лойка) кааператывам “Альянс” была праведзена яго рэстаўрацыя. З 1990 г. млын выконвае дзве функцыі: як вытворчы аб’ект працуе на памол зерня, як музей знаёміць наведвальнікаў з гісторыяй млынарства і працэсам памолу.

Быў адноўлены і ў жніўні 1992 г. адкрыты музей “Хата завознікаў” — другі аб’ект этнаграфічнага комплексу “Млын” (архітэктар М.Лук’янчык, аўтар экспазіцыі А.Краснова). Хата некалі належала жыхару Заслаўя Ясону Мяхедка-Савіцкаму і была адноўлена на колішнім месцы. У 1993 г. побач з млынам падняўся яшчэ адзін этнаграфічны аб’ект — “Свіран”(архітэктар С.Сергачоў), перавезены з Пастаўскага раёна. На гэтым працэс фарміравання першага этнаграфічнага комплексу быў часова спынены.

Недалёка ад комплексу “Млын” у 1994 г. пачалі “дыхаць” сапраўдныя кавальскія мяхі. Быў адкрыты музей “Кузня” (архітэктар С.Сергачоў, аўтар канцэпцыі М.Касцюкевіч). Паколькі ніводнай з былых заслаўскіх кузняў не захавалася, у 1997 г. з в. Камень Валожынскага раёна была перавезена і пастаўлена на ўскрайку вуліцы, каля луга, кузня. Тут стаяла кузня, якая належала калісьці мясцоваму жыхару Валяр’яну Ждановічу. Так пачалося фарміраванне другога этнаграфічнага комплексу “Сядзіба каваля”.

Яшчэ адно цікавае пачынанне — адкрыццё ганчарнай майстэрні, яе абсталяванне,пачатак выпуску сувенірных медалёў і навучанне ганчарнаму майстэрству вучняў на працягу некалькі гадоў развівалася Алесем Косткам. Запаведнік набывае асобны будынак, ствараецца праект ганчарнай салона-крама-майстэрні. На жаль, адсутнасць сродкаў для рэканструкцыі будынка і адсутнасць рэальнага механізма, які б стымуляваў і спалучаў інтарэсы майстра і бюджэтнай установы, не дазволіла вярнуць у горад гэта рамяство [4, с. 58—59].

У верасні 1992 г. у выставачным комплексе жыхары і наведвальнікі пазнаёміліся з першымі музейнымі экспазіцыямі: музычных інструментаў «Музыка вячорак» (аўтар экспазіцыі і збіральнік калекцыі У.Бярбераў) і маляваных дыванкоў «Алена Кіш. Паміж двух сусветаў» (аўтар экспазіцыі А.Сташкевіч). А ў 1995 г. у выставачным комплексе адкрываецца адна з лепшых выставак «Мара аб Заслаўі». Праект выстаўкі стаў пераможцам Рэспубліканскага конкурсу музейных праектаў і атрымаў фінансавую падтрымку фонду Сораса. Аўтары канцэпцыі А.Краснова і Н.Стрыбульская,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абапіраючыся на ідэі структураліста М.Фуко, здолелі нетрадыцыйна падысці да раскрыцця вельмі не простай тэмы, якой з'яўляецца тысячагадовая гісторыя Заслаўя [4, с. 62].

Спад стваральнай актыўнасці калектыву на другім этапе жыцця запаведніка прывёў да таго, што за перыяд з 1995 г. па 1997 г. не было ўведзена ніводнага музейнага аб'екта нават з тых , што былі завершаны яшчэ ў 1994 г.

Этапным на шляху вяртання згубленых пазіцый можна лічыць паспяховы ўдзел групы супрацоўнікаў музея-запаведніка «Заслаўе» ў першым Маскоўскім міжнародным фестывалі «Інтэрмузей». Больш за 170 музеяў Расіі, Украіны, Кыргызстана, Францыі і іншых краін прадставілі ў сакавіку 1999 г. свае выстаўкі. Свае матэрыялы прывезлі Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі і музей-запаведнік «Заслаўе». Экспазіцыя з Заслаўя «Чароўнае святло Алены Кіш» вылучалася непадробнай цікавасцю наведвальнікаў і ўдзельнікаў і была адзначана арганізатарамі двума дыпломамі [4 , с. 59].

Адначасова з аднаўленнем комплексу помнікаў вялася плённая праца музея з аўдыторыяй. З улікам радыкальных змен у дзейнасці музеяў ва ўсім свеце пачынае ўспрымацца наведвальнік. Музей дае яму магчымасць самому, пры дапамозе фантазіі і ўяўлення, "агучыць" і "прывесці ў дзеянне" статычную карціну музейнага асяроддзя. На з'яўленне новай навуковай дысцыпліны – музейнай педагогікі [5, с. 8] — першым у Беларусі адгукнўся музей-запаведнік "Заслаўе". Менавіта тут у 1990 г. быў створаны сектар, пазней аддзел музейнай педагогікі. Плёнам яго працы сталі распрацоўка і рэалізацыя цыкла музейна-педагагічных заняткаў, гэты цыкл ў 1994—1995 гг. атрымаў мэтавае фінансаванне ад Упраўлення культуры Мінаблвыканкама і аформіўся ў спецыяльную праграму падтрымкі школьнага курса «Мая Радзіма—Беларусь».

Становішча сучаснай педагогікі характарызуецца пошукам альтэрнатыўных мадэлей адукацыі. Менавіта школа павінна адкрыць дзецям разна- стайнасць шляхоў засваення культуры – прывесці іх у бібліятэку, музей, тэатр, фарміруючы тым самым устойлівую патрэбу у зносінах з культурнымі каштоўнасцямі. У сувязі з гэтым становіцца відавочнай неабходнасць распрацоўкі такой праграмы, якая б "вывела" дзяцей за межы школы, пашырыла і ажывіла працэс навучання. Яе асноўныя мэты наступныя:

— стварыць рэальную аснову для супрацоўніцтва школьнага настаўніка і музейнага педагога, якія працуюць на аснове агульных метадычных матэрыялаў;

— узбагаціць наглядным матэрыялам школьны курс для 4-га класа "Мая Радзіма—Беларусь". Дапамагчы настаўніку пачатковай школы зрабіць змест вучэбнай праграмы больш багатым і разнастайным за кошт выкарыстання патэнцыялу гісторыка – краязнаўчага музея [6, с. 15].

Такая праграма існуе ў Заслаўі, і яе першым тэматычным блокам з'яўляецца цыкл заняткаў "Знаёмства з музеем", які ўяўляецца своеасаблівым мастком паміж паўсядзённым асяроддзем дзяцей і музеем.

Этнаграфічны блок "Звычаі і побыт нашых продкаў" (уваходзяць заняткі на тэмы "Ад блакітных кветак – да кашулі дзетак", "Круціся, ганчарнае кола" , "Ішла каляда калядуючы", "Вясна–красна на ўвесь свет" і інш.) даволі поўна раскрывае прадметны свет культуры.

Цікавы блок "Як людзі жылі раней". Ён гістарычны, уключае заняткі на тэмы "Наш старажытны горад", "Знатны род Глябовічаў", "У госці да Мяхедка-Савіцкіх", "Легенды Полацкай зямлі". Апошняя тэма распрацавана намі, і заняткі па ёй з'яўляюцца своеасаблівым дэбютам аўтара артыкула ў якасці музейнага педагога.

Супрацоўнікамі музея распрацаваны комплекс экскурсій, якія разлічаны на розную аўдыторыю. Мясцовыя жыхары і замежныя турысты, дзеці і дарослыя — кожны можа разлічваць на адрасную падачу матэрыялу, з улікам яго пажаданняў.


1. *Археалогія* і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. — Мн.: БелЭн, 1993. — 786 с.

2. *Загришев И.П., Милюченков С.А.* Заславль — город древний. — Мн.: Полымя, 1986. — 47 с.

3. *Калбаска А.М.* Да праблемы класіфікацыі і тыпалогіі музеяў // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. Вып. 2. — Мн.: Нац. бібл. Беларусі, 1999. — С. 29—31.

4. *Калбаска А.М.* Музейны дыярыуш, ці Уводзіны ў новую музеялогію. — Мн.: БелІПК, 1999. — 148 с.

5. *Медведева Е.Б., Юхневич М.Ю.* Музейная педагогика как новая научная дисциплина // Культурно-образовательная деятельность музеев: Сб.тр. – М., 1997. – 119 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Міронччык В.У., Залуцкая В.Л.* Музейна-педагагічная праграма для пачатковай школы “Мая Радзіма – Беларусь” // Музейная педагогіка . Праблемы арганізацыі работы з дзецьмі. Музейныя сшыткі: Навук. метад. зб. / Уклад. В.У.Міронччык. – Мн.: БелІПК. — 1997. — С. 15—56

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ